протаархімандрыта, які назіраў за прававерпасцю друкаваных тэкстаў і зацвярджаў канчаткова рукапісы да выдання.

У гісторыі выдавецкай дзейнасці базыліянаў найбольш значнае месца займалі друкарні ў Вільні, Супраслі і Пачаеве. Ўсяго іх было 6. Гэта яшчэ друкарні ва Унёве, Львове і Мінску. У даведніку «Drukarze dawnej Polski od XV do XVIII w.» (Wroclaw,1959. T.5. S.265-266) нагадваецца яшчэ і тыпаграфія ў Жыро-віцах. В.Ластоўскі выказаў меркаванне, што ў канцы XVII ці пачатку XVIII ст. у Жыровіцкай друкарні быў выдадзены «Akafist Bogarodzicy», надрукаваны лацінкай на царкоўнаславянскай і лацінскай мовах (Ластоўскі В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. Коўна, 1924. С.586), але пакуль што ніхто з даследчыкаў не змог знайсці па бібліяграфічных крыніцах, каталогах, даследаваннях і ў архівах належачых ёй друкаў ці звестак аб выданнях друкарні. Не нагадваецца аб друкарні і ў грунтоўным даследаванні, прысвечаным дзейнасці Жыровіцкага манастыра архімандрыта Антонія (Антоний (Мельников), архимандрит. Жировицкий монастырь в истории западно-русских епархий: Дис. Одесса,1964. 476 с.)

У літаратуры аб выдавецкай дзейнасці базыліянаў ёсць звесткі аб намаганнях Ордэна пабудаваць друкарню ў Лаўрышаве, на заснаванне якой кароль Станіслаў Аўгуст выдаў прывілей у 1790 годзе. Але аб яе дзейнасці пакуль не знойдзена дакументаў. Магчыма, яна была створана, працавала некаторы час і друкавала кнігі для ўнутранага ўжывання манастыра.

Такім чынам, у межах Вялікага княства Літоўскага ў XVII-XVIII стст. працавалі тры друкарні Ордэна базыліянаў – у Вільні (1628-1839), Супраслі (1695-1804) і Мінску (1790-1793).

Матульскі Р.С.,
канд. пед. навук,
ст.выкладчык

## ПРЫНЦЫПЫ, МЭТЫ І ЗАДАЧЫ СТАНДАРТЫЗАЦЫІ Ў ГАЛІНЕ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЫ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

У сучасны момант у рэспубліцы сфарміраваны ўсе неабходныя аб'ектыўныя і суб'ектыўныя перадумовы для распрацоўкі нацыянальных стандартаў у сферы функцыянавання бібліятэчна-інфармацыйных сістэм.

Пры іх распрацоўцы неабходна зыходзіць, у першую чаргу, з таго, што нарматыўныя дакументы павінны прадугледжваць аптымальны ўзровень бібліятэчных паслуг, зніжэнне якога можа прывесці да негатыўных вынікаў, а завышэнне да невыканання з-за недастатковай падрыхтоўкі галіны да ўвядзення такога стандарта. Таму пры стандартызацыі мэтазгодна кіравацца наступнымі асноўнымі прынцыпамі:

– узаемасувязь стандартаў з законамі, ведамаснымі дакументамі, іншымі падзаконнымі і нарматыўнымі актамі;

– мэтазгоднасць, г.зн. што стандартызацыі падвяргаюцца толькі тыя аб'екты, нарміраванне якіх іншымі спосабамі не дае неабходных вынікаў;

– мінімум рэгламентацыі, таму што стандартызацыя ўводзіцца толькі на тыя аб'екты, рэгламентацыя якіх неабходна для далейшага развіцця тэорыі і практыкі бібліятэчнай справы;

– навуковасць – выкарыстанне навуковых дасягненняў у галіне бібліятэчнай справы, а таксама інфарматыкі, бібліяграфіі, педагогікі, сацыялогіі і іншых навук;

– адраснасць – канкрэтнасць сферы выкарыстання стандартаў;

– перыядычнасць – дынамізм распрацоўкі стандартаў і абнаўленне іх у адпаведнасці з патрабаваннямі часу.

Захаванне названых прынцыпаў – важная ўмова паспяховай распрацоўкі і ўкаранення стандартаў. Рэалізацыя іх мае наступныя мэты:

– садзейнічанне выкананню заканадаўства Рэспублікі Беларусь сродкамі і метадамі бібліятэчнай работы;

– абарона інтарэсаў карыстальнікаў і дзяржавы ў пытаннях асартыменту і якасці бібліятэчных паслуг;

– забеспячэнне асноўных якасных і колькасных характарыстык бібліятэчных паслуг, што адпавядаюць сацыяльнаму заказу грамадства і ўзроўню яго развіцця;

– павышэнне якасці паслуг у адпаведнасці з развіццём навукі і тэхнікі, патрэбнасцямі насельніцтва і грамадства;

– устараненне тэхнічных бар'ераў у сферы інфармацыйнага супрацоўніцтва;

– забеспячэнне канкурэнтаздольнасці паслуг бібліятэк рэспублікі на сусветным рынку інфармацыйных паслуг;

– удзел рэспублікі ў міжнародным падзеле працы.

Для выканання мэт стандартызацыі ў галіне бібліятэчнай справы неабходна рашыць наступныя задачы:

– выяўленне асноўных крытэрыяў, якія характарызуюць сацыяльны заказ грамадства на бібліятэчныя паслугі;

– распрацоўка агульных патрабаванняў да бібліятэк розных тыпаў і відаў, вызначэнне якасных і колькасных характарыстык дзейнасці бібліятэк;

– устанаўленне аптымальных (у т.л. абавязковых) патрабаванняў да якасці і наменклатуры бібліятэчных паслуг у інтарэсах карыстальнікаў і грамадства;

– зніжэнне фінансавых, матэрыяльных і працоўных затрат у дзейнасці бібліятэк.

Пры распрацоўцы нарматыўных дакументаў па стандартызацыі ў галіне бібліятэчнай справы мэтазгодна захоўваць наступныя умовы:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— адпаведнасць патрабаванняў стандартаў па бібліятэчнай справе заканадаўчым актам, а таксама нормам і правілам органаў, якія выконваюць функцыі дзяржаўнага надзору;

— гарманізацыя патрабаванняў нацыянальных стандартаў з нормамі міжнародных, рэгіянальных і нацыянальных стандартаў вядучых замежных дзяржаў;

— комплекснасць стандартызацыі ўзаемазвязаных аб'ектаў шляхам узгодненасці патрабаванняў да гэтых аб'ектаў і тэрмінаў увядзення у дзейнасць стандартаў;

— аптымальнасць патрабаванняў, уключаных у стандарты.

Бушуева В.Б.,
выкладчык

## БІБЛІЯМЕТРЫЧНЫ АНАЛІЗ ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ БЕЛАРУСКАГА ЗАМЕЖЖА

1. Сення, калі Беларусь стала суверэннай дзяржавай, калі змянілася грамадска-палітычная сітуацыя, мы атрымалі магчымасць больш даведацца пра жыццё нашых суайчыннікаў за мяжой, пра іх духоўныя і культурныя набыткі. Апынуўшыся на чужыне, нашы суайчыннікі пачалі аб'ядноўвацца ў гурткі і суполкі, захавалі родную мову, пабудавалі цэрквы, школы, бібліятэкі, музеі, клубы, стварылі навуковыя і культурна-асветніцкія цэнтры, якія маюць свае перыядычныя выданні. Першыя беларускія перыядычныя выданні з'явіліся за мяжой яшчэ ў XYI ст. у Чэхіі. З выданняў 20--30-х гадоў нашага стагоддзя найбольш вядомы часопісы, выпуск якіх быў наладжаны нашымі суайчыннікамі ў Празе. Гэта «Іскра Скарыны» (1931--35 гг.), «Беларускі студэнт» (1931--33 гг.), «Прамень» (1926), «Новы прамень» (1927), «Беларус» (1925--27). У Францыі ў 30-я гады выдаваўся часопіс «Рэха»-- орган аб'яднання французскіх беларусаў «Хаўрус». У ЗША (Чыкага) ў 1926--1932 гг. выходзіла газета «Беларуская трыбуна». Але значна больш перыядычных выданняў узнікла за мяжой апасля другой сусветнай вайны. Ствараліся яны арганізацыямі, якія ўзнікалі ў Германіі, Францыі, Вялікабрытаніі, ЗША, Канадзе, Аргенціне, Аўстраліі.

2. Дакладных звестак аб колькасці перыядычных выданняў няма. Паводле дадзеных М.Панькова, у 1945--1950 гадах на Захадзе выходзіла 129 перыядычных выданняў, некаторыя з іх працягваюць выдавацца і сення. А ў адпаведнасці з дадзенымі В.Кіпеля, толькі ў ЗША, пачынаючы з 1950 г., выйшла больш за сто беларускіх перыядычных выданняў. Калі разглядаць выданні па геаграфічнай прыкмеце, дык відаць, што ў 40-я гады найбольшая іх колькасць выйшла ў Берліне, Мюнхене, Ольдэнбургу (Германія); Беластоку (Польшча), Празе (Чэхаславакія), Парыжы (Францыя), Лондане (Англія), Сіднеі (Аўстралія). З пачатку 50-х гадоў цэнтр беларускага перыядычнага друку перамясціўся на амерыканскі кантынент.

3. Што тычыцца моўнай прыметы, то амаль усе перыядычныя выданні беларускага замежжа выдаюцца на беларускай мове, але ёсць сярод іх двухмоўныя: польска-беларускі інфармацыйна-культурны штомесячнік Усходняй Беласточчыны «Czasopis», выдаецца з 1989 г.; беларуска-англійскі рэлігійны часопіс «Царкоўны светач» (ЗША, выдаецца з 1985 г.), а таксама і англамоўныя: інфармацыйны штоквартальнік «Belarussian Review"(выдаецца з 1989 г. ЗША, Каліфорнія),штомесячны часопіс для дзелавых людзей "Belarussion Business Herald» (выдаецца з 1991 г. ЗША, Фларыда), часопіс «The journal of Belarussian Studies» (выдаецца з 1965 г.Англія, Лондан).

4. Часопісы, якія сёння выходзяць за мяжой, падзяляюцца па тэматыцы на грамадска-палітычныя, навуковыя, літаратурна-мастацкія, папулярныя, рэлігійныя. Са шматгаліновых прыкладамі могуць быць «Беларуская думка» (ЗША, Нью-Джэрсі, выдаецца з 1960 г. адзін раз у год), «Беларускі свет» (ЗША, Мічыган, выдаецца з 1959 г. адзін раз у год) і іншыя, якія адносяцца да грамадска-палітычных і літаратурна-мастацкіх, а «Веды» (ЗША, Нью-Йорк, 1949--54 гг.) з'яўляўся навукова-літаратурным. У ліку галіновых часопісаў «Шыпшына»(Германія, літаратурна-мастацкі), «Запісы» Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Йорку (навуковы), «Беларускае слова ў Амерыцы» (ЗША, грамадска-палітычны). Рэлігійная тэматыка знаходзіць адлюстраванне ў часопісах «Голас царквы» (ЗША), «Голас часу» (Англія), «Сіла веры» і «Беларуская царква». Часопіс «Зважай» (Канада, Таронта, выдаецца з 1974 г. двойчы ў год) прысвячаецца ваеннай тэматыцы, а такія выданні, як «Шарсцень» і «Маланка»,-- папулярна-гумарыстычныя.

5. Газеты беларускага замежжа амаль усе з'яўляюцца універсальнымі. На іх старонках публікуюцца звесткі грамадскага жыцця, навукі, літаратуры і мастацтва. Самымі вядомымі з іх на сённяшні дзень з'яўляюцца «Беларус» (ЗША, Нью-Йорк) -- штомесячная газета, выдаецца з 1950 г. «Беларус» мае падпісчы-каў ва ўсіх краінах, дзе існуюць беларускія дыяспары. «Голас Беларуса» -- штомесячная газета выдаецца ў Канадзе, у Таронта, з 1952 г. «Голас Варшавы» -- англамоўная газета, у якой праблемы Беларусі і бела-русаў праз польскі друк знаходзяць шлях у заходні свет.

У апошнія гады перыядычныя выданні пачалі вы-ходзіць і ў краінах бліжняга замежжа, дзе ў выніку рас-паду СССР і суверэнізацыі былых рэспублік апынулі- ся больш двух мільёнаў беларусаў. У Рызе (Латвія) з 1989 г. выдаецца газета «Голас беларуса», у Таліне (Эстонія) з 1990 г. -- газета «Грунвальд», у Санкт-Пе-цярбургу (Расія) -- з 1991 г. газета «Родзічы», у Маскве (Расія) выдаецца з 1990 г. бюлетэнь Маскоўскага таварыства беларускай культуры «Шляхам Скарыны».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ